# Агляд спраў аб фальшывых крэдытных білетах з фонду Мінскага павятовага суда (другая палова XIX ст.)

Ірына КОЛАБАВА



Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт, ганаровы член
ГА «Беларускае нумізматычнае таварыства»,
Рэспубліка Беларусь, г. Мінск,
e-mail: irynakolabava@mail.ru

Першы расійскі кадыфікаваны крымінальны кодэкс «Уложение о наказаниях уголовных и исправительных» упершыню быў апублікаваны ў 1845 г. Ён меў непасрэдную сувязь з другім заканадаўчым актам – «Уставом монетным», які рэгламентаваў парадак дзяржаўных манетных эмісій. Абодва дакументы ўваходзілі ў «Свод законов Российской империи».

Пакаранні за парушэнне грашовага заканадаўства вызначаліся ў 23 артыкулах другога раздзела «Уложения...» рэдакцыі 1857 г.

Вінаватыя пазбаўляліся ўсіх правоў, заключаліся ў турму, адпраўляліся на катаржныя работы, у арыштанцкія роты, ссылаліся ў аддаленыя рэгіёны Сібіры, неслі цялесныя пакаранні бізунамі, розгамі і кляйменнем.

На той час практыка пакарання бізунамі была абмежавана максімальнай колькасцю да 100 удараў, а розгамі – да 500. Кляйменне ў гэты перыяд уяўляла сабой накладанне на твар (паслядоўна на лоб, правую і левую шчокі) трох літар – К, А, Т («катаржны»). Праводзілася яно пры дапамозе спецыяльных igольчатых штэмпеляў з заціраннем атрыманых адбіткаў спецыяльнай фарбай. Накладанне кляйма як асобнага віду пакарання праіснавала да 1863 г.

За падробку залатой, плацінавай і меднай расійскіх манет вінаватыя пазбаўляліся ўсіх правоў і ссылаліся на катаргу на тэрмін ад 8 да 10 гадоў, а калі гэтыя асобы не былі пазбаўлены ад цялесных пакаранняў, то дадаткова атрымлівалі біццё бізунамі па 5-й ступені з накладаннем клеймаў [13, с. 173, арт. 608]. Суровае пакаранне прызначалася і за змяншэнне масы манеты, пакрыццё яе срэбрам, золатам, націранне ртуццю ці іншым рэчывам з намерам надаць большую каштоўнасць [13, с. 175, арт. 617, 618].

Падрабязна апісваліся незаконныя дзеянні з крэдытнымі білетамі: выкарыстанне падробнай і звычайнай паперы, маляванне ад рукі і механічным спосабам, наданне большага наміналу, крадзеж бланкаў для крэдытных білетаў, змяненне іх колераў [13, с. 176–177, арт. 623]. Пакаранне ў гэтых выпадках вызначалася катаржнай работай ад 1 да 10 гадоў, ссылкай у Сібір, а для адпаведных груп насельніцтва дадавалася біццё розгамі ці бізунамі з кляйменнем і перадачай у арыштанцкія роты [13, с. 176–177, арт. 623].

Аналагічнае пакаранне датычылася і асоб, якія выраблялі, дастаўлялі, набывалі штэмпелі, формы ці іншыя прылады, неабходныя для стварэння фальшывых манет і крэдытных білетаў [13, с. 174, арт. 611].

Караліся і тыя, хто проста ведаў аб здзяйсненні працэсу падробкі манет і крэдытных білетаў, але не данёс гэту інфармацыю да прадстаўнікоў улады. Акрамя пазбаўлення ўсіх правоў і заключэння на тэрмін ад 2 да 3 гадоў, іх ссылалі на жыхарства ў Томскую ці Табольскую губерні, а пры дадатковых цялесных пакараннях прызначалася біццё розгамі па 3–5-й ступені і знаходжанне ў папраўчых арыштанцкіх ротах на перыяд ад 1 да 6 гадоў [13, с. 174, арт. 612; с. 178, арт. 626]. Тыя ж, хто садзейнічаў следству і паведамляў аб сваіх паплечніках, дапамагаючы спыніць злачынствы, вызваляліся ад пакарання, а іх імёны пакідалі ў тайне [13, с. 278, арт. 625].

Разглядаліся ў заканадаўстве і выпадкі завозу на тэрыторыю імперыі падробнай расійскай манеты замежнай вытворчасці. Сфабрыкаваныя манеты канфіскоўваліся, а злачынцы атрымлівалі пакаранне, прадугледжанае за падробку манет [13, с. 174, арт. 615].

За фальсіфікацыю замежнай манеты і папяровых грошай ці прывоз падробак з-за мяжы вінаватыя караліся скасаваннем правоў, катаржнымі работамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад 4 да 6 гадоў, ссылкай у Сібір, а ў некаторых выпадках і ўдарамі бізунамі па 2–7-й ступені [13, с. 173–174, арт. 610; с. 179, арт. 629].

За ўвоз з-за мяжы нізкапробнай білоннай манеты закон патрабаваў яе канфіскацыю і грашовы штраф, які ў тры разы перавышаў намінальны кошт. Прычым у дадатках адзначалася, што польская злотавая манета высокіх наміналаў білонам не лічылася [13, с. 176, арт. 620].

Асобна агаворвалася пакаранне за пераплаўку меднай манеты папярэдніх чаканаў. Вінаватыя пазбаўляліся ўсіх правоў і ссылаліся ў Сібір, а пры нявызваленасці ад цялесных пакаранняў атрымлівалі ўдары бізунамі па 1-й ступені [13, с. 174, арт. 613].

Пакаранне ўзмацнялася ў выпадках, калі вінаватыя тым ці іншым чынам былі далучаны да працэсу вытворчасці манет і дзяржаўных крэдытных білетаў (катаржныя работы падоўжваліся на тэрмін ад 10 да 12 гадоў, а магчымыя цялесныя пакаранні праходзілі па 4-й ступені) [13, с. 173, арт. 609; с. 177, арт. 624]. На ўзроўні пакарання фальшываманетчыкаў караліся і служачыя, якія адкрывалі іншым асобам, свядома ці несвядома, спосабы вырабу крэдытных білетаў ці сакрэтныя іх уласцівасці [13, с. 179, арт. 630].

Калі ж нехта выпадкова атрымліваў фальшывую манету ці крэдытны білет і ведаючы, што ён падробны, не перадаваў яго органам улады, а пускаў у далейшае абарачэнне, той падлягаў суду за махлярства [13, с. 175–176, арт. 619; с. 179, арт. 628].

Усе знойдзеныя падробныя манеты і крэдытныя білеты, прылады і матэрыялы павінны былі быць канфіскаваны і адпраўлены для знішчэння ў Дэпартамент Горных і Саляных спраў [13, с. 174, арт. 614; с. 178, арт. 627].

Што датычыцца фактаў падробак расійскіх крэдытных білетаў, зафіксаваных у справах Мінскага павятовага суда, рацыянальна праводзіць агульны агляд шэрагу архіўных спраў, згрупаваўшы іх па наміналах у парадку ўзрастання.

У дакументах Мінскага павятовага суда зафіксаваны справы, звязаныя з падробнымі крэдытнымі білетамі наміналам ад 1 да 25 рублёў.

Так, 30.05.1865 у Мінскае гарадское паліцэйскае ўпраўленне звярнуўся дваранін Багдановіч, які паведаміў, што пры размене 10 рублёў у лаўцы месціча Слуцкага ад незнаёмца атрымаў адзін фальшывы рублёвы білет. Заўважыўшы падробку, ён хацеў вярнуць яе назад, але Слуцкі, схапіўшы «у Богдановича фальшивую бумажку, порвал на несколько частей, ...чтобы скрыть виновного, успевшего уже уйти из лавки» [5, л. 3–3 адв.]. Пазней жонка гаспадара лаўкі прызналася, што невядомая асоба – сын мінскага равіна Танхель Шапіра [5, л. 3–3 адв.].

На допыце 22-гадовы Шапіра паказаў, што ва ўзгаданай лаўцы яго папрасілі размяняць дзесяцірублёвы білет і ён «дал в числе прочих 1 р. кредитный билет, который... не помню от кого получил и рассмотреть не мог... а Богданович... по неосторожности [его] разорвал. Я, живя честно и не имея никакого участия в выпуске и в подделке фальшивых билетов, подвергнулся обыску, по коему ничего не оказалось» [5, л. 10–10 адв.].

Пры такіх абставінах 20.12.1867 суд прыняў рашэнне аб закрыцці справы за адсутнасцю вінаватых і перадачы фальшывага рублёвага білета ў Дзяржаўны банк для знішчэння [5, л. 18].

Некалькі спраў датычацца падробак трохрублёвых крэдытных білетаў. Аб фальшывым трохрублёвіку за № 929345 даносіцца ў рапарце мінскага павятовага прыстава ў Мінскі земскі суд ад 28.12.1856, дзе зафіксавана інфармацыя, паступіўшая ад прылуцкага памешчыка Уладзіміра Папова. Апошні паведамляе аб тым, што да яго звярнуўся нейкі Арон Фрэйдман з просьбай вызначыць сапраўднасць адавочна фальшывага трохрублёвага крэдытнага білета. На допыце Арон Фрэйдман паказаў, што атрымаў падробку ад шынкара карчмы ў засценку Курганы, які належаў двараніну Іосіфу Бжэзінскаму. У сваю чаргу ўладальнік карчмы Бжэзінскі патлумачыў, што ў канцы лістапада гэты фальшывы трохрублёвік «променял на мелкие деньги какой-то... служащий акцизной конторы при покупке в корчме водки» [3, л. 2 адв.] і прадставіў яго подпіс на разліковым запісе. У выніку даследавання подпіс быў вызначаны як належачы нейкаму Шэйману.

Аналагічная падробка была зафіксавана і 28.06.1865. Ад таго ж самага акцызнага наглядчыка Шэймана атрымаў фальшывы трохрублёвік пад № 23894 карчмар з в. Каралёва [3, л. 41].

Следства высветліла, што на той перыяд у Мінскай акцызнай канторы служылі купецкія сыны Шэйманы, але адзін з іх ужо памёр, а другі поўнасцю адмаўляўся ад подпісаў і ўвогуле ад прысутнасці ў гэтых карчмах [3, л. 42]. У выніку 04.08.1866 суд прыняў пастанову аб закрыцці справы за адсутнасцю вінаватых.

З фальшывым трохрублёвым крэдытным білетам звязаны яшчэ адзін дастаткова кур'ёзны выпадак. У рапарце жандармскага унтэр-афіцэра Курчатава ад 09.11.1866 паведамляецца, што «ноября 8 дня... в м. Койданавом, усмотрено... в корчме у мещанина... Петра Дзеболтовского, подделанный кредитный билет трёхрублёвого достоинства, выпущенный в 1862 и 1843 годах за № 476011» [9, л. 1–1 адв.].

Сам мешчанін Дзебалтоўскі на допыце 27.02.1867 паведаміў, што прадстаўлены трохрублёвы крэдытны білет, «в котором с правой стороны вместо номера приклеена частица другой бумаги с обозначением



*Расійскія папяровыя грашовыя знакі XIX ст. – пач. XX ст.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГЭУ

1843 года… получил в половине октября месяца прошлого 1866 года в м. Койданово от однодворца Адама Шатилы, который, вручив мне эту бумажку, просил, чтобы я разменял на мелкие деньги, … я таковую бумажку отнес… Абраму Махлису и разменял на мелкие деньги, на третий же день дочь Абрама ту бумажку принесла обратно мне, говоря, что эта бумажка не может иметь курса правой стороны, потому что вместо номера приклеена частица года от другой бумажки, почему я вынужден был Махлису выплатить своими три рубли» [9, л. 4–4 адв.]. Далей Дзебалтоўскі дадае, што Шаціла спачатку згадзіўся вярнуць грошы за яго «неаккуратную бумажку», атрыманую ад невядомых асоб у Мінску пры пакупцы ў яго вала, але толькі ў выпадку звароту яму фальшыўкі [9, л. 5–5 адв.]. Калі ж Дзебалтоўскі пайшоў да Адама Шацілы, каб вярнуць фальшывы трохрублёвік, прыбыў жандарм Курчатаў і забраў падробку сабе. У хуткім часе Адам Шаціла памёр, і суд 08.10.1869 прыняў рашэнне за адсутнасцю вінаватага закрыць справу, «а билет, потерявший курс от употребления, отослать в Государственный банк для уничтожения» [9, л. 37–37 адв.].

Некалькі спраў Мінскага павятовага суда былі звязаны з падробленымі пяцірублёвымі крэдытнымі білетамі. Першая падробка была выяўлена ў селяніна Дамініка Рамана Шавеля, які на допыце 08.03.1867 паказаў, што прад'яўлены яму пяцірублёвы білет 1851 г. выпуску за № 13710090 ён пазычыў на пакупку картуза ў старасты Велікасельскага валаснога праўлення Лявона Буэля, але аб тым, што гэты білет падробны, зразумела, не ведаў, бо непісьменны. Сам жа Лявон Буэль патлумачыў, што не можа ўзгадаць, ад каго са зборшчыкаў падаткаў атрымаў гэтую фальшыўку [6, л. 5–5 адв., л. 10, л. 17 адв.].

Аналагічная сітуацыя 09.06.1867 склалася і ў выпадку з 23-гадовым вілейскім месцічам Іцкай Гутманам, які, «покупая… у присяжного казначейства гербовую бумагу, потребовал… сдачи… из пятирублёвого кредитного билета, который сказался фальшивым» [10, л. 1–1 адв.]. У сваім тлумачэнні Гутман гаварыў, што не памятае, ад каго атрымаў гэты білет, «так как управляя имением Смолевичи князя Витгенштейна, я веду расчёты с множеством народа… Сам подделкой фальшивых кредитных билетов не занимаюсь и делателей таковых, а равно и занимающихся выпуском оных, я не знаю. Более в оправдание свое и к разъяснению дела ничего сказать не могу» [10, л. 32].

Па абедзвюх справах узгаданыя асобы былі прызнаны выпадковымі карыстальнікамі падробных крэдытных білетаў і пазбаўляліся ад пакарання.

Мяркуючы па колькасці зафіксаваных у матэрыялах Мінскага павятовага суда фактаў выяўлення фальшывых 10-рублёвых білетаў, гэты намінал у фальшываманетчыкаў быў даволі папулярным.

18.12.1862 ардынатар Мінскага вайсковага шпіталя калежскі асэсар Нарэйка паведаміў, што «будучи в лавке Эстер Поляковой за покупками… дал… купчихе двадцать пять рублей кредитными государственными билетами, из которых… Полякова дала мне сдачи двадцать три рубля также кредитными билетами, из коих два билета были по десять рубл. сереб., а третий был в три рубля». На наступны дзень Нарэйка вызначыў фальшывасць аднаго з дзесяцірублёвікаў «изданный будто бы в 1856 г. за № 7806986» [2, л. 1–1 адв.]

28.04.1867 у Мінскае гарадское паліцэйскае ўпраўленне звярнуўся дваранін Станіслаў Пяткевіч, які паведамляў аб падмене яго сапраўднага дзесяцірублёвага білета на фальшывы і сведчыў, што «…зайдя в табачную фабрику купца Гуркевича, я потребовал от приказчика… продать мне 25 штук сигар… и отдавал ему кредитный билет 10 руб.» Але прыказчык сказаў, што «билет этот весьма бледного цвета и есть фальшивый, сам с ним выбежал на улицу для спроса и совета с другими и… минут чрез пять… отдал мне билет краснейшего цвета» [7, л. 1–1 адв.].

13.01.1867 кіраўнік маёнтка Вяснянка дваранін Захарый Цэхановіч прадставіў паліцэйскім уладам дзесяцірублёвы фальшывы крэдытны білет пад № 1265795 і паведаміў, што атрымаў яго ад селяніна Пракопія Андрэева Кураша за прададзенае на мінскім кірмашы жыта. Апытаны Кураш даў тлумачэнне, што «деньги 11 р. 25 к. в том числе 10 рублёвый… один рублёвый и мелочью 25 к.» даў яму невядомы пакупнік [11, л. 1–1 адв.].

У рапарце станавога прыстава ад 11.02.1870 паведамлялася, што пры аплаце «охотніку» (асоба, якая выказала жаданне за грошы замяніць рэкрута) Макарэвічу рэкруцкіх грошай койданаўскімі месцічамі Буцяноўскім і Мазуркевічам быў знойдзены «один фальшивый десятирублёвого достоинства билет 1861 года за № 3150906» [12, л. 1–1 адв.].

24.10.1868 у Мінскім губернскім казначэйстве касірам Якаўлевым у акцызнай суме ад койданаўскага месціча Ісера Левіна быў выяўлены фальшывы дзесяцірублёвы білет 1861 г. выпуску за № 1270934. Левін паказаў, што атрымаў падробку ад мінскага купца Гутнера, які не ведаў, адкуль яна з'явілася [8, л. 4–5 адв.].

Ва ўсіх узгаданых выпадках, калі следства так і не змагло даказаць віну канкрэтных асоб, суд прымаў рашэнні аб закрыцці спраў.

26 мая 1862 г. да мінскага цывільнага губернатара з паліцыі паступіла перапіска па скарзе памешчыцы Ігуменскага павета Варвары Раўковічавай «о непринятии в народное обращение 25 рублёвого кредитного билета 1851 г. за № 416176 без номера с левой стороны», які яна прасіла замяніць на новы [1, л. 4].

У матэрыялах справы зафіксавана экспертыза Дзяржаўнага банка, у якой прадстаўлены білет прызнаваўся фальшывым па 10-м віду падробкі, што запатрабавала адкрыць крымінальную справу і правесці адпаведныя следчыя мерапрыемствы [1, л. 4 адв. 5].

Незадаволеная адмовай мясцовых улад правесці абмен на сапраўдны 25-рублёвы крэдытны білет, памешчыца афармляе зварот да Аляксандра II, дзе тлумачыць, што «30 декабря прошлого 1861 г. квартировавший в г. Минске дворянин Каликст Таранкевич был должным мне десять рублей серебром, на требование мне уплатить их он отозвался, что у него мелких денег нет». У выніку яна прыняла «25 рублевый билет, и не осмотрелась, что в билете одна нумерация совсем оторвана… ныне же оказыватся, что оный билет, по причине недостачи нумерации, терял уже свою стоимость, ибо никто из торговцев

РЕПОЗИТОРИЙ БГЭУ

промышленников не принимает оный даже в меньшей сумме. Танкевич же от дачи мне взамен онаго другога годного билета отказывается». Пацярпелая прасіла прымусіць дваraніна Калікста Таранкевіча «к даче... ходячими монетами двадцать пять рублей серебром взамен предоставляемого билета» [1, л. 7–7 адв.].

У сваю чаргу Таранкевіч патлумачыў, што за арэнду жылля ў Раўковічавай «уплатил мелкими деньгами, т. е. двумя кредитными 5 руб. билетами и от кого г. Ревковичева получила означенные выше 25 руб. кредитный билет о сем не сведущ» [1, л. 18–18 адв.].

Далейшыя падзеі прывялі да слухання 09.08.1866 у Мінскім павятовым судзе дзвюх аб'яднаных спраў – аб узгаданым фальшывым крэдытным білеце і абрабаванні самога Калікста Таранкевіча, калі той «был пьян до бесчувствия – валялся по улице в ночное время, по сему и неизвестно кто отнял у него часы с цепочкой и портмоне с деньгами...» [1, л. 144, 149].

Першая справа была закрыта ў сувязі з канчынай памешчыцы Варвары Раўковічавай, а падробны 25-рублёвы білет быў адпраўлены па інстанцыях для знішчэння [1, л. 148 адв.].

Падробная 25-рублёвая купюра ўзгадваецца і ў рапарце ад 14.06.1865 жандармскага унтэр-афіцэра Андрэева, які паведамляў, што «13 июня сего года в местечке Рубежевичах во время съезда местных жителей на базар замечена было мною фальшивая бумажка в двадцать пять рублей серебром за № 15732 1855 г. у вольного хлебопашца Матвея Колодинского деревни Дубровщины Рудицкой волости» [4, л. 1].

Пры допыце Каладзінскага было высветлена, што 25-рублёвы крэдытны білет ён атрымаў яшчэ 20.06.1864 на кірмашы ў м. Койданава пры продажы за 22 рублі ўласнай кабылы з жарэбчыкам. Гэты білет ён выкарыстаў пры набыцці новай кабылы [4, л. 1 адв. – 2 адв.]. У сувязі з тым, што віноўныя па справе выяўлены не былі, яна была закрыта.

Прыведзеныя ў аглядзе судовыя справы яшчэ раз падкрэслілі, што фашываманецтва было дастаткова пашыранай з'явай, якая закранала прадстаўнікоў самых розных сацыяльных груп насельніцтва тагачасных беларускіх зямель. Як правіла, падробныя крэдытныя білеты друкаваліся літаграфічным спосабам з выкарыстаннем металічных матрыц і мелі шэраг памылак у легендах і недакладнасцей у выявах, што заставалася па-за ўвагай звычайнага карыстальніка.

Следствы па справах аб выяўленых грашовых фальсіфікатах праводзіліся ў поўнай адпаведнасці з дзяржаўным заканадаўствам. Але ў большасці выпадкаў знайсці непасрэдных удзельнікаў працэсу вырабу і распаўсюджвання фальшывых крэдытных білетаў было немагчыма. У выніку і суды за адсутнасцю вінаватых вымушаны былі закрываць узгаданыя крымінальныя справы.

***Бібліяграфічны спіс:***

1. *Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 159. Мінскі павятовы суд. – Воп. 1. – Спр. 4201. О 25 рублёвом кредитном билете, доставшемся помещице Ревковичевой. – 155 л.*
2. *Там жа. – Спр. 4207. По отношении Минской городской полиции о 10 рублёвом фальшивом кредитном билете. – 29 л.*
3. *Там жа. – Спр. 4313. О фальшивых кредитных билетах. – 79 л.*
4. *Там жа. – Спр. 4509. О фальшивом кредитном билете 25-ти рублёвого достоинства. – 44 л.*
5. *Там жа. – Спр. 4819. О фальшивом однорублёвом кредитном билете. – 25 л.*
6. *Там жа. – Спр. 4883. О фальшивом 5-ти рублёвом кредитном билете. – 30 л.*
7. *Там жа. – Спр. 4919. О фальшивом 10-рублёвом кредитном билете. – 43 л.*
8. *Там жа. – Спр. 5882. О найденном кассиром Минского губернского купечества Яковлевым... фальшивого 10 рублёвого кредитного билета. – 47 л.*
9. *Там жа. – Спр. 6315. О фальшивом 3-х рублёвом кредитном билете. – 45 л.*
10. *Там жа. – Спр. 6369. О фальшивом кредитном билете пятирублёвого достоинства. – 59 л.*
11. *Там жа. – Спр. 7102. О 10 рублёвом кредитном фальшивом билет. – 31 л.*
12. *Там жа. – Спр. 7213. О фальшивом кредитном 10 руб. достоинства билете. – 29 л.*
13. *Свод законов Российской империи. Том пятнадцатый. Законы уголовные. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных. Глава вторая. О нарушениях Уставов монетных [Электронный ресурс] / – СПб., Изд-во: Тип. Второго Отд. Собств. Е.И.В.Канцелярии, 1857. – С. 173–179. – Режим доступа: https://runivers.ru/lib/book7372/388232/. – Дата доступа: 22.07.2019.*

# Review of cases of counterfeit credit notes from the fund of the Minsk district court (second half of the 19th c.)

**Irina KOLOBOVA,** *Belarusian State University of Culture and Arts, Candidate of Historical Sciences, associate professor, honorary member of the Public Association "Belarusian Numismatic Society", Republic of Belarus, Minsk, e-mail: irynakolabava@mail.ru.*

**Abstract.** *The article is devoted to studying archival materials related to money counterfeiting in Belarus of the 19th c. The author describes court cases indicating that counterfeiting was a common phenomenon that affected various social groups.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ